# МАГУТНЫМ УЗДЫМАМ АД КРАЮ ДА КРАЮ ГОД З'ЕЗДА САВЕЦКІ НАРОД СУСТРАКАЕ

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі ўніверсітэт

Год выдання другі
№ 17 (58)
СУБОТА 31 СНЕЖНЯ 1970 года

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ, ПРАФКОМА І МЯСЦКОМА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

Цана 2 кап.

## У НОВЫМ ГОДЗЕ— ДА НОВЫХ ЗДЗЯЙСНЕННЯЎ!

Хутка стане здабыткам гісторыі 1970 год. Ён быў знамянальным годам: савецкі народ, усё прагрэсіўнае чалавецтва адзначыла 100-годдзе з дня нараджэння У. І. Леніна. Ён быў таксама апошнім годам пяцігодкі, якую савецкія людзі выканалі паспяхова. Для нас, гамяльчан, ён быў радасны і тым, што наш горад стаў ардэнаносным.

Мы — на парозе 1971 года. Гэта — год XXIV з'езда КПСС, першы год новай пяцігодкі. Ён запатрабуе новага працоўнага напружання, прыліву творчых сіл для таго, каб паспяхова ажыццявіць грандыёзныя задачы, пастаўленыя перад савецкім народам партыяй камуністаў. І савецкія людзі ніколькі не сумняваюцца ў тым, што ўсе задачы будуць вырашаны.

Горача віншуем калектыў універсітэта з наступаючым Новым годам і жадаем вам, дарагія таварышы, новых творчых поспехаў у вучобе і працы, моцнага здароўя і вялікага асабістага шчасця.

Рэктарат, партыйны камітэт, мясцком, камітэт камсамола, прафком.




ДА 52-Й ГАДАВІНЫ ЎТВАРЭННЯ БССР

## КВІТНЕЕ НАША РОДНАЯ БЕЛАРУСЬ

Неўзабаве стане здабыткам гісторыі 1970 год — год слаўнага стогадовага ленінскага юбілею, завяршаючы год восьмай пяцігодкі.

Савецкія людзі пераступаюць парог Новага, 1971 года—года пачатку новых здзяйсненняў у камуністычным будаўніцтве, задачы якога на бліжэйшае пяцігоддзе будуць вызначаны рашэннямі XXIV з'езда КПСС. Для працоўных нашай тройчы ардэнаноснай Беларусі пачатак года будзе асабліва знамянальны — рэспубліка ўступіць у 53-ці год свайго існавання, сваей дзяржаўнасці.

1970 год для нашай рэспублікі азнаменаваўся вялікімі поспехамі у выкананні дырэктыў XXIII з'езда КПСС. Прамысловыя прадпрыемствы БССР датэрмінова завяршылі пяцігадовы план па агульнаму аб'ёму вытворчасці. Выпуск прамысловай прадукцыі павялічыўся больш чым у 1,7 раза, прадукцыйнасць працы ўзрасла на 38 працэнтаў супраць 35 па кантрольных лічбах. Вытворчасць прыбораў і сродкаў аўтаматызацыі павялічылася за мінулую пяцігодку ў 3,7 раза, мінеральных угнаенняў—у 3,3 раза, хімічных валокнаў — у 2,7 раза, электраэнергіі і вырабаў лёгкай прамысловасці — у 1,8 раза. Асваенне знойдзеных у нетрах Беларусі запасаў нафты, сільвініту і калійных солей ператварыла нашу рэспубліку ў раён вялікай хіміі.

Значныя змены за пяцігодку адбыліся ў беларускай вёсцы. Сярэднегадавы аб'ём вытворчасці зерня і бульбы павялічыўся за апошнія чатыры гады ў калгасах і саўгасах на 46 працэнтаў, мяса ў жывой вазе —на 56, малака — на 59 працэнтаў і яек — больш чым у 2 разы. За пяць год у рэспубліцы адваявана ў балот і ўключана ў сельскагаспадарчую вытворчасць больш 940 тысяч гектараў зямлі.

За гады пяцігодкі ў нас пабудавана звыш 16 мільёнаў квадратных метраў жылля. У рэспубліцы штогод спраўляюць наваселле больш 400 тысяч чалавек.

За мінулыя гады многа зроблена па паляпшэнню культурнага і бытавога абслугоўвання насельніцтва. Аб'ем работы службы быту павялічыўся у два з палавінай разы, а на сяле — больш чым у 5 разоў. Вырасла сетка медыцынскіх устаноў, колькасць бальнічных ложкаў павялічылася з 77,5 да 92 тысяч.

Хуткімі тэмпамі працягвае развівацца сістэма народнай адукацыі і падрыхтоўкі спецыялістаў. За 1966 — 1970 гады былі адкрыты дзяржаўны універсітэт у Гомелі, Брэсцкі інжынерна - будаўнічы інстытут, дзесяткі новых школ і тэхнікумаў.

Воляй Камуністычнай партыі і самаадданай працай рабочых, сялян і народнай інтэлігенцыі за гады савецкай улады Беларусь узнялася ад адсталасці да вяршынь сацыяльна-тэхнічнага прагрэсу. Грандыёзныя дасягненні нашай рэспублікі ў развіцці сацыялістычнай эканомікі , культуры і навукі з'яўляюцца тым плацдармам, які забяспечыць яшчэ больш імклівы рух да камунізма. Мы маем цяпер трывалую базу для далейшага росту прамысловай і сельскагаспадарчай вытворчасці і няспыннага паляпшэння ўмоў жыцця савецкіх людзей.

У 53-ю гадавіну рэспублікі беларускі народ уступае з яснымі мэтамі, поўны энергіі. Першым яго крокам на шляху далейшага камуністычнага будаўніцтва з'яўляецца народнагаспадарчы план 1971 года, які зацверджан дзевятай сесіяй Вярхоўнага Савета Беларускай ССР сёмага склікання.

Няма сумнення ў тым, што беларускі народ і ў далейшым будзе заўсёды і ва ўсімісці ленінскім курсам і аддасць усе свае сілы і энергію вялікай справе — пабудове камунізма ў нашай краіне.

Г. ЕЎДАКІМЕНКА,
дацэнт кафедры гісторыі КПСС і навуковага камунізма.

Ад астравоў Курыльскіх і да Брэста —
Па ўсёй любімай нашай старане
Ён неўзабаве праімчыць экспрэсам
І на зямлю апусціцца як снег.
Яго сустрэне цёпла, урачыста
І радасна вялікі наш народ,
Які пад слаўным сцягам камуністаў
Ідзе ў свой пяцьдзесят чацвёрты год...
Семдзесят першы. Мы цябе вітаем
Як год здзяйсненняў новых і надзей.
Хай птушка шчасця над зямлёй лунае —
Усім на свеце гэтага жадае
Народ, што цвёрда ў камунізм ідзе.

## Чатыры навагодніх інтэрв'ю

На парозе — Новы год. Стала ўжо традыцыяй у гэты час падводзіць вынікі папярэдняга года і намячаць планы на будучае.

Мы ад добрай традыцыі рашылі не адступаць. І вось перад вамі — чатыры навагодніх інтэрв'ю, якія надрукаваны ў сённяшнім нумары газеты.

Мы звярнуліся да прафесара, гаспадарчага работніка, выдатніка вучобы і спартсмена з двума пытаннямі:

**1. ЧЫМ ЗНАМЯНАЛЬНЫ БЫЎ ДЛЯ ВАС 1970 ГОД?**
**2. ВАШЫ ПЛАНЫ НА 1971 ГОД.**

Такім чынам, на пытанні адказваюць:

## ПРАФЕСАР



**1** 1970 ГОД быў знамянальны не толькі для нашай краіны, а і для ўсяго свету. Ён знамянальны тым, што ў гэты год усё прагрэсіўнае чалавецтва адзначала 100-годдзе з дня нараджэння У. І. Леніна.

Для мяне асабіста 1970 год з'явіўся паваротным у жыцці. Я дэмабілізаваўся з радоў Савецкай Арміі. У сакавіку пераехаў у Гомель і стаў працаваць ва універсітэце. Тут мне даверылі стварыць новую кафедру— фізікі цвёрдага цела і арганізаваць вучэбны працэс па падрыхтоўцы спецыялістаў у галіне трэння і зносу цвёрдых цел.

Я лічу гэта важнай і ганаровай задачай. У нашай краіне да апошняга часу вышэйшыя навучальныя ўстановы не рыхтавалі такіх спецыялістаў. Гомельскі універсітэт з'яўляецца першай вну, у якой арганізавана такая кафедра.

Вялікая ўвага пры арганізацыі кафедры была ўдзелена з боку парткома і рэктарата універсітэта. Шэраг заводаў Гомеля дапамагаў нам у вырабе абсталявання.

Хоць прайшло не так многа часу, нам ужо ўдалося многае зрабіць. Самае галоўнае, як мне здаецца, у нас арганізаваўся дружны калектыў, які ў асноўным складаецца з маладых спецыялістаў. Я хачу адзначыць вялікую работу па арганізацыі кафедры кандыдатаў тэхнічных навук В. А. Балакіна, Ю. А. Кашына, Г. В. Старыкавай, кандыдатаў фізіка-матэматычных навук Г. П. Шпяцькова, В. Р. Сіманава, старшых выкладчыкаў В. П. Батаева і М. І. Аляшкевіча.

**2** РАСПРАЦАВАНЫ намі вучэбны план адобран Міністэрствам вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР і Акадэміяй Навук СССР. Кафедра актыўна ўключылася ў навукова-даследчую работу. У 1971 годзе нам прадстаіць выканаць гаспадарча-дагаворныя тэмы на суму звыш 35 тысяч рублёў.

1971 год будзе рашаючым годам станаўлення нашай кафедры. Мне хацелася б, каб нашы планы на гэты год паспяхова ажыццявіліся.

Карыстаючыся выпадкам, хачу павіншаваць маіх гомельскіх сяброў з Новым годам і пажадаць ім добрага здароўя і вялікіх поспехаў у рабоце.

Д. ГАРКУНОЎ,
прафесар, загадчык кафедры фізікі цвёрдага цела.

